ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.44 (3404) ● ЧАЦВЕР, 20 ЛІСТАПАДА, 2014

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Словам і справай
Уладзімір Шугля не толькі актыўна ўдзельнічае ў гандлёва-эканамічных праектах, што рэалізуюцца паміж дзвюма краінамі, але і выдае кнігі вершаў Стар. 2

З Мінска да Хакадатэ — праз Санкт-Пецярбург і Парыж
Стар. 3

Пясняр між небам і зямлёю
На мінскай сцэне паставілі спектакль, прысвечаны Уладзіміру Мулявіну Стар. 4

СПАДЧЫНА

Ёсць чым ганарыцца

У Нацыянальнай бібліятэцы прэзентавалі альбом-каталог “Кніжная спадчына Беларусі”

Іван Ждановіч

Краіна рыхтуецца святкаваць 500-годдзе беларускага кнігадрукавання: у 2017 годзе. Час правесці рэвізію: што маем на кніжных паліцах? Чым можам ганарыцца? Цяпер сотні тамоў тэкстаў лёгка ўмяшчаюцца ў памяці камп’ютарных прылад, і папяровыя кнігі не такія запатрабаваныя. Аднак варта не забываць: на іх грунтуецца ўся наша культура, цывілізацыя ўвогуле. І ў век ІТ-тэхналогій добрая кніга паранейшаму — культурная каштоўнасць.

У альбоме, які прэзентаваўся, упершыню ў поўным аб’ёме прадстаўлены лепшыя ўзоры нацыянальнай кніжнай спадчыны з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Гэта рукапісныя і старадрукаваныя кнігі, выданні, прысвечаныя беларускай тэматыцы, рэдкія і каштоўныя кнігі, картаграфічныя і выяўленчыя выданні. Пададзены і кнігі з іншых вядомых беларускіх збораў. Фаліянт, з вялікім густам аформлены і гожа аддрукаваны, мае 416 старонак. Тэксты пададзены на беларускай, рускай і англійскай мовах. Сотні шыкоўных ілюстрацый...

Гартаеш старонкі — нібы вітаешся з рознымі аўтарамі, майстрамі, перапісчыкамі, мастакамі з даўніх часоў. Як цікава ўглядвацца ў дэталі! На прэзентацыі гаварылася: у кожным з рарытэтаў, пра якія ідзе аповед, прыхаваны вялікі аб’ём інфармацыі, сігналаў і паміж радкоў. Цяпер мастацтва кнігі губляецца, а раней кнігі былі — як святыні, так да іх і ставіліся. І каштавалі нямала, бо выраблялiся доўга і ў невялікай колькасці. Былі даступныя толькі

Так выглядае каталог

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Прэзентацыя альбома-каталога прайшла прыгожа і ўрачыста

багатай эліце грамадства. І ці ж не цуд, што сёння мы іх можам бачыць. Чытаць. Вывучаць. Тры гады працавалі над “Кніжнай спадчынай Беларусі” спецыялісты Нацыянальнай бібліятэкі. Прадмову напісаў яе дырэктар Раман Матульскі, укладальнік выдання — намеснік дырэктара Аляксандр Суша. Гэта сумесны праект выдавецтва “Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі” і Нацыянальнай бібліятэкі, рэалізаваны на заказ і пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі. Выданне выйшла ў жніўні, да Дня беларускага пісьменства.

На прэзентацыі Аляксандр Суша гаварыў, што жаданне больш дасканала вывучыць кніжныя скарбы Бацькаўшчыны і прывяло яго ў Нацыянальную бібліятэку. Раней было шмат зроблена па вывучэнні, пашырэнні ведаў пра музычную, архітэктурную, іканапісную спадчыну, скульптурныя помнікі. А пра скарбы кніжныя грунтоўных, якасна ілюстраваных, на сучасным узроўні аформленых выданняў амаль не было, у лепшым выпадку — навуковыя артыкулы ці каталогі. Нават спецыялісты лічылі, што ўсё вартае ўвагі вывезена за мяжу: выданні Скарыны паглядзець — едзь у Лондан, кнігі з бібліятэкі Радзівілаў у Нясвіжы — у Санкт-Пецярбург... На жаль, шмат што нашае цяпер не ў нас. Ды тое-сёе і мы маем — пра гэта сведчыла і выстава са збораў Нацыянальнай бібліятэкі, падрыхтаваная да прэзентацыі. Цяпер вось выйшла “Кніжная спадчына Беларусі”. Так што ёсць на чым стаяць. І — рухацца далей, таму на прэзентацыі гаварылі пра новыя праекты, вяртанне нашых кніг з замежжа ў навуковы ўжытак, факсімільныя перавыданні.

ВЕСТКІ

Зручны маршрут

У Нацыянальны аэрапорт Мінск цяпер можна дабрацца і на цягніку

Рух сучасных дызель-цягнікоў у кірунку Нацыянальнага аэрапорта Мінск арганізаваны з 7 лістапада. І цяпер, каб дабрацца туды ад вакзала Мінск-Пасажырскі, патрэбна каля 70 хвілін. Якім жа маршрутам рухаюцца цягнікі? Пакуль што — да станцыі Смалявічы, з часам чыгунку падвядуць амаль да аэрапорта. Апошнія ж 550 метраў да тэрміналаў пасажыры змогуць пераадолець на спецыялізаваных аўтобусах з нізкай падлогай ці пры дапамозе дарожкі без сходаў, якая рухаецца.

Абвешчаны і кошты квіткоў на цягнік ад вакзала Мінск-Пасажырскі да аэрапорта: 25 тысяч беларускіх рублёў. А кошт за праезд ад станцыі Смалявічы да аэрапорта — 14 600.

Спецыялісты адзначаюць, што графік руху дызель-цягнікоў да аэрапорта Мінск распрацаваны з улікам раскладу авіярэйсаў, часу праходжання пасажырамі неабходных працэдур у аэрапорце. Улічана, як прыбываюць цягнікі, што курсіруюць паміж абласнымі цэнтрамі і Мінскам.

З 8 лістапада па маршруце Мінск-Пасажырскі — Нацыянальны аэрапорт Мінск у тэставым рэжыме штодня ходзяць пяць пар сучасных трохвагонных дызель-цягнікоў ДП3. Першы цягнік у аэрапорт адпраўляецца раніцай у 5.35, апошні вячэрні — у 20.25. На гэтым чыгуначным маршруце толькі адзін прыпынак: Смалявічы. Станцыя цяпер стала і своеасаблівым перасадачным вузлом для пасажыраў, што едуць у аэрапорт з іншых месцаў.

ЗЕМЛЯКІ

Як здзяйсняюцца мары

Кацярына Мядзведская

Спявачка Вольга Сотнікава-Рамос прыязджала ў родны Мінск з сольным канцэртам з Мексікі

Оперная спявачка разам з дачкой Мілай Тамарай паўдзельнічала і ў другім Фэсце мастацтваў беларусаў свету. На Радзіме Вольга Сотнікава не была ўжо амаль дзевяць гадоў. Сёлета ж вырашыла правесці адпачынак у Беларусі, сустрэцца з бацькамі ўжывую, а не ў скайпе, пазнаёміць іх з сямігадовай Мілай Тамарай. “Мексіка ж — не блізкі свет, часта не прыедзеш, — уздыхала зямлячка, калі мы гутарылі. — А ў наступны раз збіраемся ў Беларусь ужо з мужам і ўсімі трыма дзецьмі”.

Так здарылася, што аднойчы паспяховая спявачка, салістка Белдзяржфілармоніі з першага позірку закахалася ў іншаземнага прыхільніка. А ён, не доўга думаючы, прапанаваў беларускай прыгажуні руку і сэрца. Вольга згадзілася, аднак і не ўяўляла, што з канцэрта ў Польшчы, дзе сустрэлася з будучым мужам, трапіць аж у Мексіку. “Цікава: я з дзяцінства марыла пабываць у гэтай краіне, — расказвае артыстка. — Цяпер жыву там, кожны дзень бачу горы і акіян. Сонца пякучае, а ежа лёгкая і смачная”. Хоць ёй усё даспадобы ў новым жыцці, аднак часам тужыць па бярозках, рэчках з чысцюткай вадою, па доме, дзе вырасла, парку пры ім, па любых кутках Мінска. І сёлета, як прыехала, не магла надыхацца родным паветрам, нахадзіцца па знаёмых з дзяцінства сцежках, наглядзецца ў вочы бацькоў ды нагаварыцца з імі... А матуліным пачастункам ніякая ў свеце кухня не раўня. “Гэта ж і пірог з яблыкамі, і мясны салат, і дранікі, і блінчыкі з тварагом… — згадвае Вольга. — Дачка аж прыцмоквае ад бабуліных страваў. Як вернемся, адразу на рысава-кукурузную дыету сядзем, бо, адчуваю, у сцэнічныя касцюмы не ўлезем ні я, ні дачка”.

Канцэртная дзейнасць у Вольгі ў Мексіцы даволі актыўная, і ў Мінск яна прыехала з сольным канцэртам: у Белдзяржфілармоніі прадставіла праграму “З любоўю з Мексікі”.

КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

Вольга Сотнікава-Рамос з дачкою ў Мінску

Гледачоў было шмат, а яна і не чакала, што трошкі нефальмальнае выступленне, не вельмі характэрнае для яе, зала прыме на “ўра”. “Праграма была цікавая, шматплынная, вясёлкавая — нібы сама Мексіка, — заўважае Вольга. — Я выконвала і любімыя оперныя арыі, і песні, рамансы мексіканскіх кампазітараў. Былі і прэм’еры беларускіх аўтараў: раманс Ганны Казловай “Сон кахання”, новы твор Аліны Безянсон”. ➔ Стар. 2

АСОБЫ

Словам і справай

Ганаровы консул Беларусі ў Цюмені Уладзімір Шугля не толькі актыўна ўдзельнічае ў гандлёва-эканамічных праектах, што рэалізуюцца паміж дзвюма краінамі, але і выдае кнігі вершаў

Іван Іванаў

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Уладзімір Шугля з кнігай вершаў "Чацвёртае вымярэнне"

Здымак Ганаровага консула з кнігай вершаў у руках — восеньскі. Тады ў Гарадской ратушы Мінска праходзіў Кансультатыўны савет па справах беларусаў замежжа. Уладзімір Фёдаравіч, засведчыўшы павагу да калег, спяшаўся па іншых справах. І менавіта на сходах паспеў я зрабіць пару кадраў суродзіча.

А была ж нагода мець здымак менавіта з гэтаю кнігаю! Тымі днямі стала вядома, што Уладзімір Шугля адзначаны вышэйшай узнагародай Саюза пісьменнікаў Беларусі — нагрудным знакам "За вялікі ўклад у літаратуру". Нагадаем, у Беларусі цяпер штогод на дзяржаўным узроўні ў Дзень беларускага пісьменства ўшаноўваюць пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу. Лепшыя творы, кнігі на конкурс вылучаюць аддзяленні саюза па дзесяці намінацыях, прапановы разглядаюць калегі-пісьменнікі ў творчых секцыях. Рашэнне па лаўрэатах прымае аўтарытэтная камісія. І вось сёлета ў старажытным Заслаўі па выніках конкурсу "Лепшы твор-2013" прэмія і дыплом Другой ступені ў намінацыі "Паэзія" прысуджаны паэту, члену Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміру Шуглі — за кнігу вершаў "Чацвёртае вымярэнне".

Чым адметнае гэтае выданне са светлымі нябёсамі ды белым голубам на вокладцы? "Самымі каштоўнымі падаюцца вершы, у якіх Уладзімір Шугля піша пра глыбока асабістыя рэчы, — чытаем меркаванне ў газеце "Літаратура і мастацтва" за 5 верасня. — Творы прысвечаны маці, дзецям, адзінай спадарожніцы жыцця. Тут шмат цеплыні і пяшчоты. Паэт вяртаецца ў дзяцінства, згадвае маладых бацькоў, гульні з сябрамі, адмысловы настрой. Час мінае, але нават у радках, прысвечаных сыходу блізкіх, знаходзіцца месца для хрысціянскай пакоры і светлых думак".

У наступным нумары "ЛіМа" Уладзімір Шугля так адказвае на пытанне, як яму ўдаецца сумяшчаць літаратурную і грамадскую дзейнасць: "У маёй працы, як і ў кожнага, два складнікі: дзелавы і духоўны. Важна тое, як кожны ўдасканальвае, развівае ўласныя дзелавыя і духоўныя якасці. А дзелавая сфера нашага жыцця — гэта не толькі работа, але і дом, сям'я, гаспадарка…" Дадае, што лёс чалавека, на яго думку, вызначаюць спадчыннасць, выхаванне і абставіны. Бацька ягоны, ваенны, быў родам з Карэліцкага раёна, маці — з Барысава. Шасцёра дзяцей яны выхавалі, сярод якіх Уладзімір Фёдаравіч — пяты. І менавіта бацькі-беларусы прывілі яму разуменне, што базіс духоўнасці — гэта душа. А вершы ў яго ніколі не ўзнікаюць на пустым месцы: пішуцца "праз моцныя перажыванні, праз боль". Дарэчы, падказвае чытачам суродзіч, на сайце shuglya.ru ёсць яго новы паэтычны цыкл "Через прицел души".

На прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры Уладзімір Шугля крыху расказаў журналістам і пра свае "гаспадарчыя" клопаты. Аказваецца, будучы ў Мінску, Ганаровы консул не толькі атрымліваў у Заслаўі статуэтку "Сярэбранага Купідона" за поспехі на паэтычнай ніве, але і дбаў пра пастаўкі беларускай тэхнікі для хлебных ніваў Цюменьскай вобласці. А канкрэтна — займаўся падрыхтоўкай да вельмі адказнага мерапрыемства.

Цяпер у інтэрнэце ёсць тэксты пра тое, як на высокім узроўні ў Цюмені прайшло 38-е пасяджэнне пастаянна дзеючага семінара пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. Выступоўцы адзначалі: сёння Цюменьская вобласць уваходзіць у першую дзясятку расійскіх рэгіёнаў па актыўнасці гандлёва-эканамічных сувязяў з Беларуссю. Як вядома, першыя нашы суродзічы з'явіліся ў рэгіёне ў канцы XIX стагоддзя, цяпер у вобласці — каля 50 тысяч беларусаў. Гаварылі і пра тое, што ў савецкі час яны актыўна ехалі на будоўлі Заходняй Сібіры, узводзілі там гарады і пасёлкі. Напрыклад, горад нафтавікоў Лангепас пабудаваны цалкам беларусамі.

Уладзімір Шугля, гаворачы пра важную ролю вобласці як эканамічнага партнёра Беларусі, удакладніў: трэцяя частка тавараабароту Беларусі і Расіі — цюменьская. У рэгіён пастаўляюцца тавары народнага спажывання, харчовая прадукцыя. Сярод прыярытэтаў — сельгастэхніка. За апошнія чатыры гады аб'ём продажаў яе ўзрос: там прададзена больш за паўтары тысячы трактароў, штогод рэалізуецца да 60 камбайнаў "Палессе" і больш за 200 іншых сельгасмашын. На думку Ганаровага консула, беларуская прадукцыя заняла годную нішу і будзе карыстацца попытам у спажыўцоў рэгіёна. За апошнія гады цюменьцам пастаўлена больш за 350 беларускіх аўтобусаў, якія добра сябе зарэкамендавалі, працуе сумеснае прадпрыемства па зборцы ліфтаў і ліфтавага абсталявання.

Помніцца, з якім гонарам летась увосень, калі беларускія журналісты былі ў камандзіроўцы ў Цюмені, Уладзімір Фёдаравіч расказваў нам пра стварэнне Выставачна-дылерскага цэнтра "Пышмінская даліна". І цэнтр, праз які масава пастаўляецца ў Цюмень беларуская тэхніка, ужо дзейнічае — яго наведвалі ўдзельнікі семінара. Між тым, каб з'явіўся такі вялізны шматпрофільны аб'ект у пасёлку Вінзілі, непадалёк ад абласнога цэнтра, нямала сіл прыклаў і наш суродзіч Уладзімір Шугля. Ганаровы консул, прадпрымальнік і паэт у адной асобе.

ДЫЯСПАРА

Да Дзядоў — з пашанаю

Беларусы Малдовы спраўлялі абрад Дзяды ў кішынёўскім Доме нацыянальнасцяў

Актывісты Беларускай абшчыны Малдовы разумеюць: мова, культура, традыцыі продкаў — гэта аснова нашай грамадскай дзейнасці. Бо так лёгка чалавеку ў замежжы згубіць нацыянальную адметнасць, растварыцца, страціць "святое штосьці" — тое, што і робіць нас беларусамі. Старажытны абрад Дзяды нагадвае нам, як важна мець жывую повязь са сваім родам. Гэта дае сілы, каб пераадольваць цяжкасці. Аднак, палічылі мы, сёння ў даўняга абраду могуць быць свае асаблівасці. Вось і сабраліся беларусы 10 лістапада ў кішынёўскім Доме нацыянальнасцяў, каб памянуць продкаў, ушанаваць памяць тых, хто пайшоў у свет іншы. Вечарыну ладзіла Беларуская абшчына Малдовы пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Малдове і Бюро міжэтнічных адносін Малдовы.

Беларуская манета "Дзяды". 2008 г.

Як вядома, у аснове абраду Дзяды ляжыць культ продкаў — іх на Беларусі з язычніцкіх часоў называюць Дзядамі. Даследчыкі сцвярджаюць: у найбольш архаічнай форме абрад захаваўся толькі ў беларусаў. У народным календары знакавы дзень сімвалізаваў канчатковы прыход восені. Паводле вераванняў, на Дзяды (у трэцюю суботу па Пакровах) душы памерлых прыходзяць у свае дамы на памінальную вячэру. Удзень беларусы ідуць да магіл родных, каб прыбраць іх, паставіць свечкі — ушанаваць памяць Дзядоў. Вечарам ладзіцца ў хаце, доме рытуальны памінальны стол, і ежа павінна быць на ім пераважна гарачаю: каб духі маглі ўдыхаць водары страў, прыгатаваных у іх гонар. Яшчэ на стол кладуць больш лыжак, чым трэба едакам: для Дзядоў. Кожнага памерлага перад вячэрай называюць па імені.

На нашых Дзядах прайшла памінальная паніхіда. Яе правёў настаяцель Свята-Георгіеўскай царквы айцец Мікалай Фларынскі. Мы ўшанавалі памяць памерлых сяброў Беларускай абшчыны Малдовы, якія працавалі ў суполцы ў розныя гады, гожа сцвярджаючы ў Малдове нашу беларускую прысутнасць. Спадзяемся, з Неба-Выраю яны і цяпер спрыяюць у нашых справах. Згадалі, дарэчы, і пра тое, што лік ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны за апошнія гады ў суполцы істотна скараціўся: у 2010-м было 25 чалавек, цяпер іх толькі чацвёра.

Разам мы глядзелі фільм пра дзейнасць Беларускай абшчыны Малдовы. Згадвалі тых сяброў і таварышаў, з якімі разам працавалі, згадвалі родных і блізкіх. Дзяліліся ўспамінамі, чыталі вершы, прысвечаныя тым, хто цяпер існуе ў нябачнай рэальнасці — у ганаровым статусе Дзядоў.

Юры Статкевіч, г Кішынёў

ЗЕМЛЯКІ

Як здзяйсняюцца мары

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Вольга Сотнікава спявае на многіх мовах, і з асаблівай асалодай па-беларуску. Мексіканцы, па яе словах, у захапленні: цікавяцца, хто такія беларусы, што за краіна. Шмат расказвае яна пра Радзіму і студэнтам на занятках у Акадэміі музыкі ў горадзе Талука: там выкладае вакал. Па-за праграмай знаёміць маладых спевакоў з музычнай спадчынай Беларусі. Так і жыве: выкладае музыку, выступае з сольнымі канцэртамі, супрацоўнічае з філармоніяй у Мексіцы, музыкамі-інструменталістамі, канцэртмайстрамі. Ёсць і праекты з сімфанічным аркестрам філармоніі Талукі.

І ў сям'і ўсё добра. Каханы муж Марка Антоніа, які працуе ў сферы камп'ютарнай тэхнікі, узяў на сябе фінансавае забеспячэнне сям'і. Радуюць дзеці. Дачка Міла Тамара займаецца спевамі, грае на скрыпцы. Разам з маці яна выступала і ў Мінску, прытым была самай юнай удзельніцай Фэсту мастацтваў. Хлопчыкі-блізняты Павел Антоніа і Марыя Эрнэста, якім па чатыры гады, больш цягнуцца да тэхнікі і, як бацька, цікавяцца камп'ютарам. Але і спяваюць добра, на гітары вучацца граць.

Дарэчы, у Мексіцы, па словах Вольгі, у пашане трывалыя родныя сувязі. Ім з мужам пашанцавала мець вялікую радню: у мужа 12 братоў і сясцёр, у якіх ужо свае сем'і. У святы збіраюцца разам, на ранча бацькоў. "Уявіце сабе: 56 самых блізкіх людзей прызджаюць у бацькоўскі дом! — не стрымлівае эмоцый Вольга. — Разам гатуем, прыбіраем, у садзе наводзім парадак, і потым самае цікавае: смех, весялосць, гумар, танцы і музыка. Мае дзеці заўсёды ў цэнтры ўвагі. Хлопчыкам на галовы — самбрэра, бяруць свае маленькія гітары, а Мілачка спявае". У такія хвіліны, гаворыць жанчына, становіцца вельмі радасна і прыходзіць адчуванне, што ўсё ў жыцці атрымалася: муж, дзеці, праца... Ды яшчэ ж хочацца, вельмі хочацца, каб побач у гэтай вялікай сям'і былі і яе, Вользіны, родныя: маці, тата, брат ды пляменнікі. "І хто ведае, — усміхаецца Вольга, — можа так яно калі-небудь і будзе".

КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

Самая юная ўдзельніца Фэсту Міла Тамара з мамай і бабуляй

Хакадатэ. Адноўлены будынак расійскага консульства

Рэканструкцыя кабінета расійскага консула XIX ст.

Бюст Іосіфа Гашкевіча скульптара Алега Комава ў Хакадатэ

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

З Мінска да Хакадатэ — праз Санкт-Пецярбург і Парыж

У розных гарадах свету пабывала выстава, прысвечаная юбілею дыпламата Іосіфа Гашкевіча

Як вядома, сёлета — Год Іосіфа Гашкевіча. Такое рашэнне было прынята на 37-й Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА і зафіксавана ў Календары памятных дат на 2014—2015 гады. Каб ушанаваць памяць пра слыннага беларуса, адзначыць яго 200-я ўгодкі, у Беларусі распрацаваны план юбілейных мерапрыемстваў. Нацыянальнаму гістарычнаму музею Беларусі было даручана арганізаваць адпаведную выставу. Экспазіцыя расказвае пра дзяржаўнага дзеяча, вучонага, жыццё і дзейнасць якога цесна звязаны з Беларуссю, Расіяй, Кітаем, Японіяй, іх гісторыяй і культурай. У праекце прынялі ўдзел і Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальная бібліятэка, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, а таксама Пасольства Японіі ў Беларусі, Дзяржаўны музей гісторыі Санкт-Пецярбурга, Расійская нацыянальная бібліятэка ў Санкт-Пецярбурзе, Архіў знешняй палітыкі Расійскай імперыі ў Маскве, кракаўскі Музей гісторыі фатаграфіі імя В. Ржавуцкага, прыватныя калекцыянеры.

Важна, што цяпер мы ведаем месца нараджэння земляка. Раней лічылася: гэта вёскі Якімава Слабада. Пра тое, дарэчы, пісала і газета "Голас Радзімы" ў тэксце "Сцежкамі Іосіфа Гашкевіча" (27 сакавіка 2014 года): "Архівісты ўстанавілі дакладна: нарадзіўся Іосіф Антонавіч у вёсцы Стралічава былога Рэчыцкага павета (цяпер Хойніцкі раён), дзе яго бацька быў святаром у мясцовай Міхайлаўскай царкве. Пацвярджэнне таму ёсць і на адным з сайтаў у інтэрнэце. Але чаму ўзнікла блытаніна? Верагодна, з-за таго, што ў царкве вёскі Якімава Слабада быў святаром малодшы брат Іосіфа Гашкевіча — Андрэй. І семінарыст Іосіф часам заязджаў пагасцяваць да яго". Нагадаем, будучы дыпламат закончыў Мінскую духоўную семінарыю, Пецярбургскую духоўную акадэмію. На працягу 10 гадоў знаходзіўся ў складзе Рускай духоўнай місіі ў Кітаі. Вывучыў некалькі ўсходніх моў, сабраў вялікую калекцыю флоры і фаўны Кітая, Японіі, Індакітая, Філіпін, Карэі. Пазней, у 1852-55 гадах, Іосіф Гашкевіч быў у складзе дыпмісіі адмірала Пуцяціна ў Японію, прымаў удзел у падрыхтоўцы і падпісанні першага Руска-японскага дагавора. А ў 1858-65 гадах ён плённа працаваў на пасадзе расійскага консула ў горадзе Хакадатэ. Займаўся і навуковай дзейнасцю. Падрыхтаваў першы Японска-рускі слоўнік, уганараваны прэстыжнай Дзямідаўскай прэміяй Імператарскай акадэміі навук і залатым медалём.

Пасля адстаўкі Іосіф Гашкевіч вярнуўся ў Беларусь, пасяліўся ў маёнтку Малі — цяпер Астравецкі раён Гродзеншчыны. Там і пісаў даследаванне "Аб каранях японскай мовы". Памёр у 1875 годзе. І ёсць падставы меркаваць, што ў Астраўцы, пры мясцовым касцёле быў і пахаваны.

Экспазіцыя "Іосіф Гашкевіч: дыпламат, вучоны-арыенталіст" у сакавіку-маі працавала ў залах Гістарычнага музея. Была выстава-трансформер, з тэкставай і фотаінфармацыяй пра жыццё і дзейнасць Гашкевіча на стэндах, дэманстраваліся копіі архіўных дакументаў. Адмыслова для выставы былі выраблены гістарычныя рэканструкцыі касцюмаў навучэнца Мінскай духоўнай семінарыі, расійскага консула XIX стагоддзя. Інсталяцыя "Кабінет расійскага консула ў Японіі", складзеная з фондавых матэрыялаў музея, разам з творамі дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва са збору Мастацкага музея Беларусі, гравюрамі японскіх мастакоў і фотаздымкамі пачатку XX стагоддзя з відамі японскіх гарадоў, мястэчак, культавых пабудоў надалі паказу ўсходні каларыт і атмасферу таго часу. Завяршалася экспазіцыя выявай бронзавага бюста І. Гашкевіча работы скульптара Валяр'яна Янушкевіча.

Летам выстава працавала ў Палацы Румянцавых — філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга. Паказ дапаўнялі ўзоры беларускіх строяў, этнаграфічныя малюнкі даследчыка Міхася Раманюка са збору Гістарычнага музея Беларусі. Расійскі музей прадставіў творы выяўленчага мастацтва, прысвечаныя Санкт-Пецярбургу XIX стагоддзя, Расійская нацыянальная бібліятэка — арыгінал выдання першага Японска-рускага слоўніка 1857 года, падрыхтаванага Іосіфам Гашкевічам. На адкрыцці выставы прысутнічаў і выступіў з прывітальным словам консул Японіі ў Санкт-Пецярбурзе Ёсіхіра Ямамура.

Пастаяннае прадстаўніцтва Беларусі пры ЮНЕСКА ў верасні арганізавала выставу ў Штаб-кватэры гэтай арганізацыі ў Парыжы. На цырымоніі яе адкрыцця з прывітальным словам да прысутных звярнуўся Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка. Спадар Альфрэда Перэс дэ Арміньян адзначыў: для яго ўдвая прыемна адкрываць такую выставу ў першы дзень яго працы ў якасці намесніка дырэктара ЮНЕСКА па пытаннях культуры.

Далей наша выстава паехала ў японскі партовы горад Хакадатэ, дзе ў свой час прайшла консульская служба Іосіфа Гашкевіча. Экспазіцыю разгарнулі ў Цэнтры падтрымкі грамадзянскай ініцыятывы. У адкрыцці выставы ўдзельнічалі Пасол Беларусі ў Японіі Сяргей Рахманаў, Пасол Расіі ў Японіі Яўген Афанасьеў. Адметна, што поруч з супрацоўнікамі Гістарычнага музея Беларусі ў складзе дэлегацыі былі і студэнты Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржуніверсітэта. У першыя дні працы выставы для культурнай грамадскасці Хакадатэ ладзілася відэапрэзентацыя "Гісторыя і культура Беларусі". На канферэнцыі, прысвечанай дзейнасці Іосіфа Гашкевіча, гаварылі пра тое, як далей развіваць трохбаковае супрацоўніцтва паміж установамі культуры і адукацыі Беларусі, Расіі ды Японіі.

Як бачым, асоба славутага земляка і цяпер збліжае народы ў іх памкненнях да сяброўства і супрацоўніцтва.

Ніна Калымага, Алег Ладзісаў,
супрацоўнікі Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі

ТРАДЫЦЫІ

Паэты даўняе пары

Іркуцкія беларусы ладзілі гістарычна-літаратурную сустрэчу і паміналі продкаў

Дзень памяці продкаў Дзяды мы адзначалі 1 лістапада. У беларусаў у гэты дзень заведзена збірацца за сталом і ўспамінаць пра сваіх продкаў, расказваць сямейныя гісторыі і легенды, частавацца рытуальнымі стравамі. А ў Іркуцкім таварыстве беларускае культуры імя Яна Чэрскага склалася і такая традыцыя: штогод ладзім на Дзяды літаратурна-гістарычную сустрэчу. Пачынаем з рытуальных дзей, заканчваем вялікім застоллем-бяседай.Пра ўласных продкаў пры тым не надта згадваем: гэта ўсё ж лепей рабіць дома, у коле сваёй сям'і. Затое распавядаем пра знакамітых беларусаў, якія пакінулі значны след у гісторыі, навуцы, літаратуры ды іншых сферах жыцця.

Сёлета тэмаю сустрэчы стала беларуская паэзія XIX стагоддзя. А якіх паэтаў з тых часоў мы ведаем? Згадалі Купалу і Коласа, Багдановіча і Танка — але ўсе яны тварылі ў XX стагоддзі. А ёсць жа Ян Чачот, Вінцэсь Каратынскі, Зося Манькоўская (Тшашчкоўская)... У тых паэтычных часінах шмат розных таямніц. За паўтары гадзіны прагучала некалькі дакладаў. Гаварылі пра творчасць удзельніка таемнай суполкі філаматаў Яна Чачота, які прысвяціў адну з беларускамоўных песень блізкаму сябру Адаму Міцкевічу. Пэўна, вялікі паэт і спяваў з сябрамі па-беларуску. Згадалі пра ўдзельніка паўстання 1830 года Аляксандра Рыпінскага. Дарэчы, ён прапанаваў карыстацца літарай "ў", з паўколам наверсе, што мы і цяпер робім. Праўда, наваўвядзенне было на лацінцы: "ŭ".

Зацікаўленасць выклікала біяграфія Зоф'і Тшашчкоўскай, даследчыкі называюць яе і Зосяй Манькоўскай: яна пісала пад псеўданімам Адам М-скі. Беларускамоўныя вершы паэткі былі знойдзены ў архівах толькі ў 70-я гады XX стагоддзя. Вялася размова і пра доўгую гісторыю з высвятленнем аўтарства паэмы "Тарас на Парнасе". Цяпер вядома: гэта Канстанцін Вераніцын, ураджэнец Гарадоцкага раёна. Узгадваліся імёны Уладзіслава Сыракомлі, Францішка Багушэвіча, Яна Баршчэўскага, Янкі Лучыны ды іншых. Усяго ж героямі Дзядоў сталі 12 паэтаў. Былі аповеды пра іх біяграфіі, чыталіся творы. Матэрыялы з вечарыны будуць апублікаваны ў нашай газеце "Маланка".

Скончылася сустрэча святочным застоллем. Дарэчы, на беларускія сталы ў Іркуцку вяртаецца нацыянальная ежа. Яшчэ 5-6 гадоў таму на святах "з беларускага народнага" ў нас былі хіба дранікі — цяпер часцей мы бачым на сталах кіслы хлеб, аўсяны ці льняны кісель, бабку. На мінулым святе, здаецца, упершыню з'явілася капытка — страва, пра якую мы раней толькі чулі.

Госць вечарыны — доктар медыцыны Анатоль Рэут

І яшчэ. На свята Дзяды завітаў да нас цікавы чалавек, якога можна назваць жывой легендай: іркуцкія беларусы пра яго чулі, ды мала хто бачыў. Гэта ўраджэнец Міншчыны Анатоль Ануфрыевіч Рэут, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Ён 18 гадоў таму стаяў ля вытокаў беларускага руху ў Іркуцку, адзін са стваральнікаў Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. Дарэчы, Анатоль Ануфрыевіч адзначыў свой 84-ы дзень нараджэння 6 лістапада. Шчыра віншуем!

Аляксей Кухта, г. Іркуцк

ПАДЗЕЯ

Пясняр між небам і зямлёю

На мінскай сцэне паставілі спектакль, прысвечаны Уладзіміру Мулявіну

Іван Ждановіч

“Заснавальніку і нязменнаму кіраўніку ансамбля “Песняры” Уладзіміру Мулявіну прысвячаецца,” — чытаем на праграмцы. На сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драмтэатра імя М. Горкага спектакль паставіла Валянціна Еранькова. А тэатральную версію дзеі паводле п’есы Васіля Дранько-Майсюка зрабіў Аляксей Еранькоў, загадчык музычнай часткі тэатра. Яму ж належыць і музычная канцэпцыя спектакля, ён і на авансцэне збоку ўвесь час — грае на гітары, вядзе клавішныя і часам вакальныя партыі ў музычных кампазіцыях, на якія багатая пастаноўка. Выконваюцца ж пераважна вядомыя песні з рэпертуару “Песняроў”.

Гэта хвалюючы, часам да спазмаў у горле, аповед не толькі пра Уладзіміра Мулявіна — пра лёс Бацькаўшчыны, лёсы іншых творцаў, найперш беларускіх песняроў. Таму на сцэне разам з Песняром, ролю якога выконвае Сяргей Жбанкоў, з’яўляюцца Янка Купала (Аляксандр Ждановіч), Якуб Колас (Андрэй Захарэвіч), Максім Багдановіч (Іван Стральцоў) і Цётка (Анастасія Шпакоўская). У спектаклі ёсць і прамыя паралелі з фактамі біяграфіі ўраджэнца Свярдлоўска, рускага па нацыянальнасці, які з 1963 года жыў у Беларусі і вельмі шмат зрабіў для пашырэння ў свеце беларускай песні, найперш фальклорнай спадчыны. Аднак стваральнікі спектакля ўзнімаюцца над фактамі да высокіх абагульненняў. Стасункі народа і песняра, творцы і музы, зберажэнне духоўнай спадчыны, любоў высокая і цынічная “гульня ў любоў” да “сінявокай Беларусі” (моцны вобраз Чорнага стварае Сяргей Чэкерэс), пакуты ад раскрыжавання душы творцы паміж зямнымі рэаліямі ды ягоным памкненнем да нябесных ідэалаў… Тонкія адценні ідэй, светапоглядаў пранізваюць жывую, насычаную цудоўнай музыкай і спевамі тканку нацыянальнага па духу і змесце спектакля. Акцёры Рускага тэатра, дарэчы, цудоўна працуюць на беларускай і рускай мовах: яны гарманічна суіснуюць на сцэне. Яшчэ я часам лавіў сябе на думцы: у тэмбры голаса Сяргея Жбанкова, які шмат спявае па ходзе спектакля, чуецца нешта мулявінскае. Ды і яго сябры-спевакі Уладзімір Глотаў, Андрэй Сенькін, Павел Еўтушэнка, Васіль Грачухін, Раман Дзерваед прыгожыя ў сваіх ролях. Нездарма ж, дарэчы, трупу Рускага тэатра называюць адной з найбольш пявучых у краіне.

ДАР’Я АНДРЭЕВА

Сяргей Жбанкоў (у цэнтры) у ролі Песняра

ДАР’Я АНДРЭЕВА

Якуб Колас (Андрэй Захарэвіч) і Янка Купала (Аляксандр Ждановіч)

Спектакль стаў важнай падзеяй у жыцці не толькі Рускага тэатра. Ва ўсёй Беларусі з вялікай пашанай ставяцца да Уладзіміра Мулявіна, ягонай творчасці, да “Песняроў”. Пры Беларускай дзяржкансерваторыі ў гонар музыкі, спевака, кампазітара, народнага артыста БССР і СССР названы бульвар. У стварэнні спектакля ўдзельнічалі супрацоўнікі Музея У. Г. Мулявіна. У бліжэйшы час у Мінску плануецца ўстанавіць помнік Мулявіну — дакладную копію таго, што гэтай восенню адкрыты на яго радзіме ў Екацерынбурзе.

Асобнай увагі заслугоўвае і сама п’еса “Пясняр” Васіля Дранько-Майсюка, які нарадзіўся на Палессі, у Давыд-Гарадку, а цяпер жыве ў Маскве. Васіль атрымаў у Мінску адукацыю мастака-графіка, культуролага і рэжысёра драмы, друкаваўся ў шэрагу выданняў. Працуе цяпер акцёрам, да таго ж “піша сцэнары ды п’есы” — чытаем у 5-м нумары альманаху “Тэксты”, дзе цалкам змешчаны твор “Пясняр”. Яго жанр аўтар вызначае так: “Фантазія ў 2-х дзеях з Пралогам ды Эпілогам”. Вядомы паэт Леанід Дранько-Майсюк глядзеў прэм’ерны паказ спектакля і, было бачна, за сына яму вельмі прыемна. “У Васіля ж яшчэ тры п’есы надрукаваны ў часопісе “Верасень”, — сказаў мне Леанід. — Гэта “Жывая казка пад Новы год”, “Мара жанчыны” і “Цуда-малпа”. Спадзяюся, на іх таксама звернуць увагу тэатральныя рэжысёры”.

ВЕСТКІ

З бразільскім каларытам

Рыгор Арэшка

Адметны праект “вулічнага мастацтва” рэалізуецца ў Беларусі з удзелам заакіянскіх мастакоў

Бразільска-беларускі street art фэст “Vulica Brasil” (Вуліца Бразіў) — першы міжнародны фэст такога роду ў краіне. Два месяцы ў Мінску, па 9 снежня, супольна працуюць бразільскія і беларускія мастакі. У нядаўняй прэс-канферэнцыі ўдзельнічалі арганізатары і партнёры фэсту, у тым ліку прадстаўнікі Мінгарвыканкама, посольства Бразіліі ў Беларусі, Цэнтра Сучасных Мастацтваў (там і праходзіла прэзентацыя праекта), Музея сучаснага выяўленчага мастацтва, а таксама самі стрыт-арт мастакі. Гаварылася, што стрыт-арт (вулічнае мастацтва) Бразіліі цяпер — гэта адна з самых яркіх форм выяўленчага мастацтва ў свеце. Вось і ў Мінску прымаюць яго прызнаных майстроў. У плыні фэсту, ініцыяванага бразільскім пасольствам, сваё мастацтва прадэманструюць чатыры зоркі сусветнага стрыт-арту. Яны ўдзельнічаюць у разнастайнай праграме, у тым ліку і ў роспісе сценаў чатырох мінскіх будынкаў. Прайшлі таксама выстава ў Цэнтры Сучасных Мастацтваў, лекцыя пра ўплыў стрыт-арту на гарадское асяроддзе, быў урок малявання для дзяцей-сірот у горадзе Уздзе. Зроблена інсталяцыя “Бразільска-беларускі горад”, якая дэманструецца на плошчы Якуба Коласа, у цэнтры сталіцы.

Пад час фэсту багаты досвед калег пераймаюць беларускія мастакі гэтага кірунку. А ёсць жа адметныя таленты не толькі ў Мінску, але і ў Брэсце, Лідзе, Віцебску, Гомелі, Рэчыцы, Маладзечне, Оршы, Полацку ды іншых гарадах.

ТВОРЧАСЦЬ

За вернісажам — вернісаж

Свой 60-гадовы юбілей выпускнік Беларускай акадэміі мастацтваў, член Саюза мастакоў Малдовы Вячаслаў Ігнаценка адзначыў шэрагам персанальных выстаў

Чытачы “Голасу Радзімы”, пэўна, ведаюць: Вячаслаў родам з вёскі Пярэдзелка, што непадалёк ад Дняпра ў Лоеўскім раёне, на беларускім Палессі. Ён цяпер — намеснік старшыні Беларускай абшчыны Малдовы. Чарговая выстава майстра пад назвай “Усім, хто любіць Малдову і Беларусь” арганізавана нядаўна Беларускай абшчынай Малдовы і артсалонам “Артсувенир” пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Малдове. У экспазіцыі — каля сотні работ: беларускія і малдаўскія пейзажы, эцюды, творы ў іншых жанрах. На вернісажы былі Часовы павераны ў справах Беларусі ў Малдове Андрэй Кароль, дэпутаты парламента Малдовы, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі. Выставу наведаў кіраўнік Дэлегацыі Еўрапейскага саюза ў Малдове Пірка Тапіёла з жонкаю. Усе яны высока ацанілі працы, талент і майстэрства Вячаслава Ігнаценкі.

Выстава мастака паспрыяе далейшаму ўмацаванню сувязяў, даверу і дружбы паміж народамі Беларусі і Малдовы. Ураджэнец Гомельшчыны даўно жыве і працуе ў Малдове, вучыўся ж — у вядомых майстроў беларускага жывапісу. У тэксце “І буду я дома…”, змешчаным у “Голасе Радзімы” 4 жніўня 2011 года, чытаем: “Яго дарога ў мастацтва была няпростай: маляваў з маленства, а падрыхтоўкі бракавала нават для мастацкага вучылішча. Працаваў слесарам, тэрмістам на Мінскім заводзе шасцерняў, вечарамі наведваў заняткі ў мастацкай студыі Палаца піянераў — іх вёў педагог Сяргей Каткоў, у іншых месцах. Галоўнае, прызнаецца, шукаў асяродак мастакоў, каб было ў каго павучыцца. Урэшце пасля арміі з чацвёртага разу прайшоў у Тэатральна-мастацкі інстытут, скончыў там у 83-м інтэр’ернае аддзяленне. Праз Каткова Вячаслаў пазнаёміўся з земляком, народным мастаком і, мабыць, найлепшым пейзажыстам Беларусі Віталем Цвіркам: “нават жыў у ягонай майстэрні месяцаў з восем” — гэта была вялікая школа. А ў студэнцкім інтэрнаце тры гады Ігнаценка жыў у адным пакоі, “варыўся ў адным творчым катле” з прызнаным ужо майстрам пейзажу Валерыем Шкарубам, яны і цяпер сябры. “Мінскае кола” — моцная частка сілы, што кліча яго на Радзіму”.

Вячаслаў пастаянна ўдзельнічае ў выставах у Малдове, Украіне, Беларусі, краінах далёкага замежжа. Работы яго ёсць у Мастацкім і Гістарычным музеях Беларусі, Мастацкім музеі ды Музеі прыроды і этнаграфіі Малдовы, шэрагу іншых збораў розных краін. Сёлета мастак адзначае 60-я ўгодкі, і выстава “Дыханне зямлі” ладзілася ўвесну ў Кішынёве, а летам і ў Гомелі: у галерэі імя Гаўрылы Вашчанкі была ягоная выстава “Гульня”. Увогуле на рахунку майстра каля 40 персанальных выстаў: Мінск, Гомель, Кішынёў, Ціраспаль, Бельцы, Камрат, Адэса, Белгарад-Днястроўскі, Таронта.

Вячаслаў Ігнаценка з народнай артысткай Малдовы Маргарытай Івануш

Вячаслаў Ігнаценка актыўна працуе і ў Беларускай абшчыне Малдовы, перадае творчы досвед і ўменне юным мастакам — у нядзельным класе беларускай суполкі.

Юры Статкевіч, старшыня праўлення Беларускай абшчыны Малдовы, г. Кішынёў

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў

Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

E–mail: golas_radzimy@tut.by

Аб’ём выдання: 1 друк. арк. **Тыраж:** 1930, **Заказ:** 1522

Час падпісання ў друк: 20.10 Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.

© “Голас Радзімы”, 2014